**Зацвярджаю**
**Начальнік аддзела адукацыі**
**Дзяржынскага райвыканкама**
**В.І.Матусевіч**

# Раённая алімпіяда па беларускай мове.
# 7 клас, 2009 год

**Заданне 1.** Запісаць назву.

1.Найменшай граматычнай моўнай адзінкі, якая выражае пэўнае значэнне________________.

2.Марфемы - агульныя часткі роднасных слоў_______________________

3.Часткі слова, якое выражае яго індывідуальнае лексічнае значэнне_____________

4.Марфемы, якая звычайна знаходзіцца ў слове пасля канчатка ці формаўтваральнага суфікса________________

5.Марфемы, якая ніколі не сустракаецца ў нязменных формах_________________

6.Злучальнага элемента, які звычайна размешчаны паміж каранямі ў складаных словах______________________

**Заданне 2.** Указаць колькасць гукаў у прапанаваных сказах:

| Сказ | Гук | Колькасць |
|---|---|---|
| 1)Каласок да каласка - і зараз жа снапоў сціrта. | [с] | |
| 2)Горш, калі баішся : і ліха ж не мінеш, і надрыжышся. | [ш] | |
| 3)Без галавы, што без рук. | [а] | |
| 4)Не адцягнеш, як ката ад мышы. | [т] | |
| 5)Людзі і сякерай голяцца, а мы і брытвай не ўмеем. | [j] | |
| 6)Калі дзед - ёсцьб і абед, няма дзеда - няма і абеда. | [д] | |
| 7)Не скачы на высокія горы, бо на нізкія сядзеш. | [с] | |

**Заданне 3.** Падкрэсліць словы, якія ўтвораны складана-суфіксальным спосабам.

Металарэжучы, двухрадкоўе, філфак, малаверагодны, чатырохпавярховы, абібок, школа-інтэрнат, фотаапарат, пяцітонны, жалезабетонны, трохмільённы, своеасаблівасць, бульбакапалка.

Заданне 4.Падабраць прыметнікі да назоўнікаў. Утварыць словазлучэнні.
___________________ подпіс,___________________ журы, _______________ шымпанзэ, _____________ гусь,_____________ боль, _______________ Нарач, _____________ філе,___________________ канфеці , _______________ тарнада,______________ салямі, ____________ герань,_____________ Антарыю.

**Заданне 5**.Запісаць усе магчымыя спалучэнні слоў першага і другога слупкоў.

| | |
|---|---|
| Два | студэнты |
| дзве | хворы |
| двое | бусляня |
| абодва | мы |
| абедзве | рукавіца |
| | суткі |

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________

**Заданне 6**.Падкрэсліць няправільна сканструяваныя словазлучэнні, выправіць іх.

Камяністая дарога, квактанне жаб, дажджлівы плашч, цікаўны твор, драпежныя птушкі, дыялектычны атлас, несуцяшальныя словы, яблычны сад, прыгодніцкі раман, пясочны бераг, ягадная паляна, дзейны сродак, балотная мясцовасць.

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
__________________________________________________

**Заданне 7.**Вызначыць сінтаксічную ролю неазначальнай формы дзеяслова ў сказах.

1.Няхай паслужыць мне здароўе, як пілігрыму кій дарожны.
2.Камандзір перадаў загад спыніцца.
3.Трымаць сябе ў руках заўсёды нялёгка.
4.Брат летам паедзе паступаць у палітэхнічную акадэмію.
5.Лясныя рэкі вучылі плаваць, а лес карміў нас, сушыў анучы.

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

**Заданне 8.**Запоўніць табліцу.

| **Бэжавы -** | **светла-карычневы** |
|---|---|
| Пурпуровы - | густа -… |
| | ярка-чырвоны |
| ружовы - | … - чырвоны |
| | бліскуча-жоўты |
| карычневы - | …- жоўты |
| рыжы - | … - жоўты |
| | жоўта - чырвоны |
| хакі - | шаравата - … -зеленаваты |
| электрык - | ярка - … з адмысловым шэрым адценнем |
| кармазынавы - | … |

**Заданне 9**.Успомніць беларускія словы і словазлучэнні, эквівалентныя наступным запазычанням.Запісаць.

Адэкватны -________________, індыферэнтны - ________________________, маніторынг - ___________________________, індыкатыў -_______________________ , экспансія - ___________________________ , кампетэнцыя - _________________________ , электарат - ___________________________ , элегантны - ___________________________

**Ключы Алімпіядныя заданні 7 клас**

Заданне 1.Запісаць назву.

Адказы:1.Марфема 2.Корань 3.Аснова 4.Постфікс 5.Канчатак 6.Інтэрфікс(злучальная галосная)

Заданне 2.Указаць колькасць гукаў у прапанаваных сказах:

Адказы:

| Сказ | Гук | Колькасць |
|---|---|---|
| 1)Каласок да каласка - і зараз жа снапоў сціртa. | [с] | 3 |
| 2)Горш, калі баішся : і ліха ж не мінеш, і надрыжышся. | [ш] | 3 |
| 3)Без галавы, што без рук. | [а] | 3 |
| 4)Не адцягнеш, як ката ад мышы. | [т] | 1 |
| 5)Людзі і сякерай голяцца, а мы і брытвай не ўмеем. | [j] | 5 |
| 6)Калі дзед - ёсцьб і абед, няма дзеда - няма і абеда. | [д] | 2 |
| 7)Не скачы на высокія горы, бо на нізкія сядзеш. | [с] | 3 |

Заданне 3.Падкрэсліць словы, якія ўтвораны складана-суфіксальным спосабам.
Адказы: Металарэжучы, двухрадкоўе, чатырохпавярховы, пяцітонны, бульбакапалка, трохмільённы.

Заданне 4.Падабраць прыметнікі да назоўнікаў. Утварыць словазлучэнні.

Адказы. Прыгожы подпіс,міжнароднае журы,вялікі шымпанзэ,шэрая гусь,пякучы боль, глыбокая Нарач, рыбнае філе, рознакаляровае канфецi, моцны тарнада, свежая салямі, пахучая герань, шырокае Антарыо.

Заданне 5.Запісаць усе магчымыя спалучэнні слоў першага і другога слупкоў.
Адказы: Два (студэнты, хворыя, бусляняты).Дзве (рукавіцы).Двое (студэнтаў, хворых, буслянят, мы, сутак).Абодва (студэнты,хворыя,бусляняты, мы).Абедзве (мы, рукавіцы).

Заданне 6.Падкрэсліць няправільна сканструяваныя словазлучэнні, выправіць іх.
Адказы. Квактанне жаб - кваканне жаб, дажджлівы плашч - дажджавы плашч, цікаўны твор – цікавы твор, дыялектычны атлас- дыялектны атлас, яблычны сад - яблыневы сад, пясочны бераг - пясчаны бераг, дзейны сродак - дзейсны сродак, балотная мясцовасць – балоцістая мясцовасць.

Заданне 7.Вызначыць сінтаксічную ролю неазначальнай формы дзеяслова ў сказах.

Адказы 1Выказнік. 2Азначэнне. 3Дзейнік. 4.Акалічнасць. 5Дапаўненне.

Заданне 8.Запоўніць табліцу.

Адказы:

| **Бэжавы** | **Светла-карычневы** |
|---|---|
| пурпуровы | густа-чырвоны |
| **румяны** | ярка-чырвоны |
| ружовы | **светла-ч**ырвоны |
| **залаты** | бліскуча-жоўты |
| карычневы | **буравата-**жоўты |
| рыжы | **чырвона-**жоўты |
| **аранжавы** | жоўта- чырвоны |
| хакі | шаравата-**карычнева-**зеленаваты |
| электрык | ярка-**сіні** з адмысловым шэрым адценнем |
| кармазынавы | **малінавы** |

Заданне 9.Успомніць беларускія словы і словазлучэнні, эквівалентныя наступным запазычанням.Запісаць.

Адказы:

1.**Адэкватны** - раўназначны , тоесны.

2.**Індыферэнтны** - 1)абыякавы, раўнадушны;2)які не дзейнічае, не рэагуе на знешнія ўмовы (індыфэрэнтнае рэчыва).

3.**Маніторынг** - 1)сістэматычнае назіранне і кантроль за станам зямельнага фонду для своечасовага выяўлення змен, папярэджання і ліквідацыі негатыўных працэсаў і тэндэнцый; 2)збор інфармацыі, звестак у сродках масавай камунікацыі, радыёперахват.

4.**Індыкатыў** - абвесны лад (дзеяслова).

5.**Экспансія** - пашырэнне, распаўсюджанне.

6.**Кампетэнцыя** - 1)дасведчанасць, вопытнасць у якой небудзь галіне;2)кола паўнамоцтваў, правоў якой-небудзь установы, асобы (к.суда).

7.**Электарат** - кола выбаршчыкаў, што галасуе за якую-небудзь палітычную партыю на парламенцкіх, прэзідэнцкіх, муніцыпальных выбарах.

8.**Элегантны** - зграбны, прыгожы, з густам.